Пералётны від. Птушка ледзь большая за вераб'я. Даўжыня цела складае ад 16 да 17 см. Верхняя частка цела шаравата-ружовая з цёмнымі стракацінамі, ніжняя частка – бялявая. На галаве ёсць характэрная маска, на патыліцы – падоўжаныя чорныя пёры, падобныя да маленькіх рагоў.

Птушка ўсім добра вядомая. Вясною прылятае адной з першых, нагадваючы аб сабе меладычнай звонкай песняй. Самцы палявых жаваранкаў спяваюць, як правіла, на ляту, часта пры гэтым завісаючы над адным месцам і трапечучы крыламі. Птушка прылятае ў сакавіку, гэта супадае з часам, калі з'яўляюцца праталіны на палях. У Пінску прылёт жаваранкаў пачынаецца ўжо у канцы лютага, рэдка ў пачатку красавіка.

Насяляе палі і рэдкія гаі, нізкатраўныя лугі, сухія пусткі і шырокія чыстыя вырубкі, гняздзіцца нават на газонах на ўскрайках гарадоў, трымаецца зямлі, на дрэвы ніколі не садзіцца. Для гнязда выбірае паглыбленне і высцілае яго травінкамі. Гняздо часта размяшчаецца зусім адкрыта, але заўважыць яго досыць складана дзякуючы ахоўнаму акрасу яек – светла-бурых, густа пакрытых шэравата-бурым крапам. У кладцы 3–5 яек памерам у сярэднім 23,5x17,0 мм і вагой каля 3,5 г. Птушаняты вылупляюцца пакрытымі доўгім шэрым пухам, але сляпымі і бездапаможнымі, у астатнім развіцці ўсё як у іншых вераб'іных. Яшчэ не ўмеючы лётаць, ва ўзросце 9–10 дзён, маладыя жаваранкі пакідаюць гняздо. Праз тыдзень яны нядрэнна лётаюць. Адлятаюць гэтыя птушкі ў верасні–кастрычніку, ляцяць невялікімі стайкамі.